УДК 821.161.3-2

# П'ЕСА "КАСТУСЬ КАЛІНОЎСКІ. СМЕРЦЬ І НЕЎМІРУЧАСЦЬ" У. КАРАТКЕВІЧА ЯК МАСТАЦКАЯ ВЕРСІЯ ГІСТАРЫЧНЫХ ФАКТАЎ

**А. М. Макарэвіч**
(Установа адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова», кафедра літаратуры і міжкультурных камунікацый)

*Характарызуюцца састаўляючыя п'есы "Кастусь Каліноўскі. Смерць і неўміручасць" У. Караткевіча як мастацкай версіі гістарычных фактаў: 1) час і месца падзей; 2) падзеі і факты; 3) гістарычныя постаці; 4) ідэйная пазіцыя адлюстраваных гістарычных асоб, а таксама дапаможных для іх раскрыцця драматургічных вобразаў.*

Мастацкая версія гістарычных фактаў – праблемнае адлюстраванне пэўных перыядаў жыцця і дзейнасці рэальнай гістарычнай асобы з характэрным для яго мастацкім вымыслам, эстэтычнай канцэпцыяй у адлюстраванні і вытлумачэнні фактаў жыцця рэальнай гістарычнай асобы ў кантэксце адпаведных абставін і сацыяльнага акружэння. Такія прататыпныя факты могуць быць агульнавядомымі або не да канца высветленымі, са сваімі "белымі плямамі", неадназначнымі ці супярэчлівымі з пазіцыі гістарычнай праўды. Мастацкая версія, акрамя вызначанага вышэй, можа грунтавацца на адным са складнікаў аўтарскай канцэпцыі адлюстравання гістарычных фактаў: асоба ў гісторыі – гэта жывы чалавек з яго схільнасцямі, памкненнямі, таемнымі жаданнямі і скрухай з прычыны нечага нязздзейсненага.

П'еса У. Караткевіча "Кастусь Каліноўскі" пастаўлена тэатрам імя Якуба Коласа (1978), упершыню надрукавана ў часопісе "Полымя" (1980). У жанравых адносінах яна класіфікуецца як трагедыя. Твор мае каля дзесяці варыянтаў, два з якіх – "Руна пра Кастуся", "Кастусь Каліноўскі" – "Руна пра Кастуся" (абодва – 1963).

Спраецыруем вызначаныя складнікі ў прыведзеным вышэй азначэнні "мастацкая версія гістарычных фактаў" на трагедыю У. Караткевіча "Кастусь Каліноўскі. Смерць і неўміручасць". Да іх ліку адносім наступныя састаўляючыя: 1) час і месца падзей; 2) падзеі і факты; 3) гістарычныя постаці; 4) ідэйная пазіцыя адлюстраваных гістарычных асоб, а таксама дапаможных для іх раскрыцця драматургічных вобразаў. Вобразна-выяўленчае спалучэнне гэтых састаўляючых уяўляе сабой своеасаблівую рэканструкцыю гістарычных фактаў у форме мастацкай версіі.

*I. Час і месца падзей.* Паводле заўвагі аўтара "дзея пачынаецца ў маі 1863 – канчаецца ў сакавіку 1864 года" [1, с. 6]. Кожная з карцін трагедыі рэпрэзентуе падзеі, якія, з аднаго боку, сугучныя ідэі паўстанцкага змагання, а з другога, непасрэдна не звязаны паміж сабой разгорнутымі прычынна-выніковымі і часавымі сувязямі. Мастацкі час п'есы, такім чынам, ахоплівае перыяд ад пачатку паўстання на Беларусі і Літве пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага і да моманту смяротнага прысуду "дыктатару Літвы і Беларусі". Падзеі твора адбываюцца ў ваколіцах вёскі Бахарэвічы, Пецярбургу, Мінску, Вільні. Больш разгорнутыя, дамінуючыя сярод іх – бахарэвічаўскія і віленскія сцэны.

*II. Падзеі і факты.* Яны прадстаўлены ў бахарэвічаўскай, віленскай, пецярбургскай, мінскай мастацка-падзейнай прасторы.

Супастаўленне прыведзеных вышэй мастацкіх састаўляючых трагедыі У. Караткевіча "Кастусь Каліноўскі. Смерць і неўміручасць" з гістарычнымі падзеямі дазваляе зрабіць выснову пра дамінаванне ў падзейнай плоскасці твора прыкмет мастацкай версіі эпізодаў змагання К. Каліноўскага і яго паплечнікаў. Да гістарычных фактаў, адлюстраваных у п'есе, адносім наступныя. Агульныя факты: саюз Каліноўскага і сялянства ў паўстанні; супрацьстаянне "белых" і "чырвоных"; агітацыйная праца сярод сялянства; кіруючая роля Каліноўскага ў паўстанні на Беларусі і Літве; Вільня як апошні змагарны і жыццёвы прытулак кіраўніка паўстання; змаганне з паўстанцамі з боку царскай сістэмы як спланаваная жорсткая карная акцыя. Прыватныя факты: карыстанне Каліноўскім дзеля канспірацыі прозвішчамі Макарэвіч і Вітажэнец; пражыванне Каліноўскага ў два апошнія месяцы яго жыцця ў Вільні; апошні канспіратыўны прытулак кіраўніка паўстання ў "Свентаянскіх мурах"; здрада Парафіяновіча; вядзенне следства па справе Каліноўскага палкоўнікам Лосевым; апазнанне Каліноўскага Марыяй Грэгатовіч; паказанні дворніка Ігнася Шосціка (Шоціка) у час следства; допыты Каліноўскага; замена смяротнага пакарання Каліноўскага праз расстрэл на павешанне. Гэтыя і іншыя гістарычныя факты рэканструююцца ў п'есе паводле прынцыпу "так магло быць" (толькі некаторыя з іх маюць гістарычнае пацвярджэнне на ўзроўні падзейнасці і яе паслядоўнасці: здрадніцкія паказанні Парафіяновіча, арышт Каліноўскага, паказанні дворніка Шосціка (Шоціка); апазнавальнае сведчанне Марыі Грэгатовіч, некаторыя факты допытаў Каліноўскага, смяротны прысуд "вярхоўнаму ваяводу Беларусі і Літвы).

*III. Гістарычныя постаці.* Да іх ліку адносім наступныя: Кастусь Каліноўскі, генерал-губернатар Міхаіл Мураўёў, імператар Аляксандр II, жандарскі палкоўнік Лосеў, палкоўнік Шалгуноў, паручнік



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Гогель, Вітаўт Парафіяновіч, Марыя Грэгатовіч. У адносінах да апошніх дзвюх постацяў азначэнне “гістарычныя” ўмоўнае.

Мастацкае раскрыццё вобразаў гэтых асоб У. Караткевіч здзяйсняе ў адпаведнасці з аўтарскай канцэпцыяй адлюстравання характару гістарычнай асобы і яе ролі, уплывах на адпаведныя гістарычныя падзеі. Некаторыя са складнікаў такой канцэпцыі ў праекцыі на трагедыю “Кастусь Каліноўскі. Смерць і неўміручасць” знаходзім у аўтарскіх “Заўвагах для акцёраў” – выканаўцаў роляў у спектаклі па гэтым творы. Тут У. Караткевіч звяртаў увагу на жанравыя асаблівасці пачатковых варыянтаў твора – асаблівасці руны. Так, напрыклад, даючы заўвагі акцёрам адносна выканання пэўных роляў, аўтар звяртае ўвагу на тое, “чаго *нельга* рабіць *ні ў якім разе*, бо гэта не адпавядае характару, задуманаму аўтарам” [1, с. 575].

Канстатуем далей некаторыя факты “задуманага аўтарам” у адносінах да яго герояў. Гэта дазволіць зразумець асаблівасці мастацкай рэканструкцыі падзей і – галоўнае – адметнасць гістарычных постацяў, увасобленых у некаторых драматургічных героях гэтага твора.

Каліноўскі: “ён ваявода, герой, талент, але ніяк не правадыр, не манумент” – “проста чалавек, страсны, гарачы, нястрыманы” [1, с. 575].

Лосеў: “прыродна разумны”, “хітрая і небяспечная асоба” [1, с. 575].

Мураўёў – “чалавек з трагедыяй”, “разумны, жорсткі”, “як вораг – страшны”, “як разбэшчвальнік душ – жахлівы” [1, с. 576].

Парафіяновіч – “дзевятнаццацігадовы няўдачнік” [1, с. 576].

Гогель – “гэта не проста нягоднік” – “нягоднік з прэтэнзіямі” [1, с. 576].

Названыя вышэй і іншыя дзеючыя асобы маюць аўтарскую характарыстыку непасрэдна ў тэксце. Яна ўкладваецца ў вусны тых драматургічных герояў, якія з’яўляюцца сведкамі іх учынкаў. Так, напрыклад, патэнцыйную здольнасць Парафіяновіча да здрады вызначае Юзэфа Яневіч (карціна дзявятая), а прычыну яго адмаўлення ад вочнай стаўкі з Каліноўскім коратка акрэслівае старшыня следчай камісіі палкоўнік Шалгуноў (карціна дванаццатая); сутнасць помслівага апазнання Марыяй Грэгатовіч Каліноўскага характарызуе палкоўнік Шалгуноў (карціна дванаццатая); спачувальнае і чалавечае жаданне Шоціка абараніць Каліноўскага ў час следства падкрэсліваецца аўтарскімі рэмаркамі і стылем маўлення гэтага героя п’есы і інш.

Акрэсленыя вышэй складнікі канцэпцыі У. Караткевіча ў адлюстраванні гістарычных падзей у трагедыі “Кастусь Каліноўскі. Смерць і неўміручасць” сведчаць пра тое, што для драматурга найбольш важным было ўзнавіць не столькі чыстыя факты гісторыі ў іх гістарычнай дакладнасці, колькі стварыць карціну чалавечых узаемаадносін з улікам матывацыі ўчынкаў, іх сутнасці і выніковасці. Такая рэканструкцыя гістарычных падзей і характараў у іх вымагала рассоўвання межаў гістарычнай прасторы, даступнай для аўтара на момант стварэння трагедыі, і суб’ектыўнага напаўнення яе паветрам праўды пра чалавечы характар у гістарычных абставінах.

**Літаратура**

1. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Т. 8, кн. 1. П’есы. Нарыс. – Мінск : Маст. літ. – 591 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова